## РОСТ ЦЭН І ДЭВАЛЬВАЦЫЯ




ТОП БЕЛАРУСКІХ СТРАХАЎ

СТАР. 5



# ТУТ І ЦЯПЕР

WWW.SVABODABY.NET



## СУМНІЎНЫЯ РЭКОРДЫ

ЧАМУ НА ІХ ІДЗЕ МАГІЛЕЎШЧЫНА



СТАР. 7



**БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА** **18.11.10-24.11.10 г.**


# САЦЫЯЛАГІЧНЫЯ ВОЙНЫ

Не паспеў Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў агучыць бягучыя рэйтынгі прэтэндэнтаў на пасаду кіраўніка дзяржавы, як сваю версію на гэты конт агучыў інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце.




*У войнах, няхай і сацыялагічных, не зацікаўлены ніхто*

Напрыканцы кастрычніка незалежныя сацыёлагі зладзілі чарговае агульнанацыянальнае апытанне. У прыватнасці, у грамадзян Беларусі спыталіся аб тым, за каго б яны прагаласавалі, калі б прэзідэнцкія выбары адбыліся заўтра. Вынікі даследавання засведчылі істотны рост папулярнасці апазіцыйных кандыдатаў.

| | Верасень, % | Кастрычнік, % |
|---|---|---|
| Аляксандр Лукашэнка | 43,6 | 48,2 |
| Уладзімір Някляеў | 5,1 | 16,8 |
| Андрэй Саннікаў | 3,0 | 8,6 |
| Алесь Міхалевіч | 2,3 | 6,4 |
| Яраслаў Раманчук | 2,6 | 6,1 |

Не адрэагаваць на гэтыя звесткі ўлады не маглі. Неўзабаве з’явіліся даныя штотыднёвага маніторынгу, які праводзіць інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце. Ягоныя вынікі для гэтага самага прэзідэнта значна больш прыемныя. Так, паводле версіі ІАЦ, за Аляксандра Лукашэнку гатовы прагаласаваць 67,8% выбаршчыкаў, а рэйтынг астатніх прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта нібыта не перавышае 1%.

Каму верыць? Кожны вырашае сам. Адзначым толькі, што ёсць катэгорыя выбаршчыкаў, якія сумняваюцца ў аб’ектыўнасці і афіцыйных, і недзяржаўных сацыёлагаў.

Што асабіста да мяне, дык звесткі НІСЭПД я лічу значна больш праўдападобнымі. Гэты інстытут не толькі паведамляе пра рост папулярнасці апазіцыйных прэтэндэнтаў, але ж і падае досыць высокі рэйтынг Лукашэнкі. А вось ІАЦ лічыць, што ніводны з сапернікаў кіраўніка дзяржавы за межы статыстычнай памылкі не выходзіць. Вельмі сумніўна.

Да таго ж рэйтынг ІАЦ дзіўным чынам супадае з пажаданымі Лукашэнкам вынікамі гэтых выбараў. Той крыху раней заявіў, што задаволіцца, калі на выбарах яго падтрымаюць дзве траціны выбаршчыкаў. І калі ласка: 67% ужо “за”. Як замаўлялі.

Цікава, што даныя НІСЭПД і ІАЦ сур’ёзна разыходзяцца нават па такім, на першы погляд, бяскрыўдным пытанні, як адсотак тых, хто наогул збіраецца браць удзел у галасаванні: адпаведна 73,2% і 91%. Але насамрэч гэта таксама прынцыповы для ўлады момант. Ёй важна загнаць на выбарчыя ўчасткі (у тым ліку датэрмінова) як мага больш грамадзян. Таму не дзіўна, што ўжо зараз ІАЦ прагназуе неверагодна высокую яўку.

Наогул мы будзем назіраць яшчэ шмат сацыялагічных войнаў вакол будучых выбараў. Дзеючая ўлада імкнецца стварыць бачнасць адносна свабодных і сумленных выбараў, таму яна будзе дамагацца прызнання легітымнасці выбараў усімі магчымымі сродкамі, як на Захадзе, так і на Усходзе.

Няма сумненняў, што будуць выкарыстаны і псеўданезалежныя структуры, у прыватнасці аналітычны цэнтр Ecoom, які хоць і з’яўляецца недзяржаўным, але заўсёды распаўсюджвае звесткі выключна на карысць дзеючай улады. Ну і, натуральна, розныя арганізацыі кшталту БРСМ у дзень выбараў зладзяць экзіт-пулы, вынікі якіх амаль супадуць з лічбамі, якія крыху пазней агучыць старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына (“член команды президента”, як яна сама прызнае).

Здавалася б, хто гэтаму паверыць? Але ж заявіла (паводле агенцтва “Ройтэрс”) прэзідэнт Даля Грыбаўскайтэ на сустрэчы за зачыненымі дзвярыма, што Аляксандр Лукашэнка мог бы набраць 99% галасоў. Калі надта захочаш гэта даказаць, то і БРСМ паверыш...

**ВАЛЯНЦІН СЫЧ**

**ПАДЗЕЯ**



## НАСЕЛЬНІЦТВА МАСАВА СКУПЛЯЕ ВАЛЮТУ

Чысты попыт на наяўную валюту ў кастрычніку вырас у 11 разоў.

Чыстая купля беларусамі замежнай валюты (наяўнай і безнаяўнай) у кастрычніку 2010 года склала 317,2 млн долараў. Пра гэта паведамляецца ў справаздачы Нацыянальнага банка.

Між тым у верасні чысты попыт насельніцтва на замежную валюту складаў 62,8 млн долараў. Такім чынам, чыстая купля насельніцтвам замежнай валюты ў кастрычніку вырасла ў 5,1 разу ў параўнанні з папярэднім месяцам пасля росту за верасень амаль у 2 разы ў параўнанні са жніўнем.

Прычым чысты попыт на валюту гатоўкай у кастрычніку склаў 253 млн долараў, што ў 11 разоў больш у параўнанні з вераснем.

Такая паніка на валютным рынку звязана з масавымі чаканнямі дэвальвацыі. Як вядома, дэфіцыт бягучага рахунку Беларусі дасягнуў рэкорднага памеру. З новага года сітуацыю можа пагоршыць чарговы рост цэн на расійскія нафту і газ.

Кіраўнік місіі Міжнароднага валютнага фонду Крыстафер Джарвіс адзначыў на брыфінгу, што банкруцтва Беларусі пакуль не пагражае. У выпадку пагаршэння сітуацыі МВФ можа разгледзець пытанне аб дадатковай фінансавай падтрымцы Беларусі ў студзені наступнага года.

**СЯРГЕЙ ГЕЗГАЛА, NN.BY**

# ВЫ ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО ЖЫВЯЦЕ Ў КВІТНЕЮЧАЙ КРАІНЕ?

**СЛАВАМІР АДАМОВІЧ, ПАЭТ:**

## «У ЛЮДЗЕЙ НЯМА НА ШТО КУПІЦЬ СВАЁ ПРАЦВІТАННЕ».

– Марафетам, які навялі на вуліцах, нікога не падманеш. Рэальную карцінку я бачу, калі іду на рынак у Курасоўшчыне. Маленькі рыначак напаўпусты. А тыя прадаўшчыцы, што там працуюць, гатовыя ў цябе з рук вырваць апошнія паперкі. І моляць: купі хоць што-небудзь. І стан гэтага рынку лепш за ўсё паказвае агульны стан нашай краіны. У людзей няма «купілава». Я летась прыязджаў з Нарвегіі, але такога збяднення не было. Як можна жыць на 500 тысяч пенсіі, як у маёй маці. А новыя рахункі за камуналку? Вось і ўсё працвітанне.

**УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## «ГУМАНІТАРНЫ АСПЕКТ НАС ЦЯГНЕ НАЗАД».

– Гэтае перамяшчэнне на 29 пунктаў я вымушаны прызнаць правільным падыходам да падліку індэкса. Калі мы параўнаем аб'ектыўны эканамічны аспект без ідэалагічнага складніка ў Беларусі, то мы не на шмат паказчыкаў адрозніваемся ад бліжэйшых суседзяў. Сапраўды відавочна, што ўзровень жыцця ў Беларусі вышэйшы, чым на Украіне, Расіі, Малдове, Румыніі, Балгарыі. Мы праводзілі ў 2008 годзе аналіз рынку працы і бачылі, што, сапраўды, наша месца не такое нізкае. Але ж гэта, калі мы бяром толькі эканамічныя чыннікі гэтага індэкса. Калі мы засяродзім увагу на гуманітарных аспектах, на якасці жыцця, а не на яго ўзроўні, то паказчыкі якасці жыцця – бяспека маёмасці, бяспека землеўладання і г.д. і даступнасць цывілізацыйный скарбонкі, культуры, адукацыі і г.д. – цягнуць нас назад. Калі б беларускія ідэалагічныя дактрыны ўлічвалі гэтыя паказчыкі, гэта дало б нам такі штуршок да развіцця, што гэта падняло б і ўзровень жыцця. І мы мелі б усе шансы выйсці зноў на тыя, цяпер ужо міфічныя, пазіцыі, калі мы былі на адным узроўні з Чэхіяй.

**АЛЕСЬ ПАПЛАЎСКІ, ПІСЬМЕННІК, БРЭСТ:**

## «ПРАЦВІТАННЕ – ГЭТА НЕ ГЛАМУР».

– Пра якое працвітанне можна казаць? Я ведаю, у якой краіне жыву. Я ведаю, што не патрэбен як асоба, як літаратар, як чалавек, які думае не так, як трэба. Справа нават не ў грошах. Справа ў тым, што, здаецца, я жыву ў хворым грамадстве, якому яшчэ спатрэбіцца гадоў дваццаць, пакуль вырасце новае пакаленне, якое пачне мысліць па-новаму. У Брэсце я заўважаю толькі знешні гламур, які спрабуюць паказаць турыстам. Сімвалам працвітання ў нас з'яўляецца вуліца Савецкая. Але за знешнім гламурам яшчэ ёсць душа. Усё павінна быць у гармоніі.

**ДА ВЕДАМА**

Беларусь паднялася на 29 пунктаў у спісе самых квітнеючых краін свету (рэйтынг Legatum Prosperity Index), паведамілі карэспандэнту БелТА ў прэс-службе Міністэрства эканомікі.

Па індэксе нацыянальнага дабрабыту ў 2010 годзе наша краіна заняла 54-е месца са 110 у спісе самых квітнеючых краін свету (у 2009 годзе Беларусь была 85-й).

Рэйтынг Legatum Prosperity Index публікуецца з 2006 года брытанскім незалежным навукова-даследчым інстытутам Legatum. У адпаведнасці з метадалогіяй праекта, рэйтынг краіны вызначаецца шляхам вылічэння сярэднеўзважанага значэння субіндэксаў, якія адлюстроўваюць такія складнікі дабрабыту, як ключавыя макраэканамічныя паказчыкі, якасць адукацыі і аховы здароўя, развітасць дэмакратычных інстытутаў, арганізацыя кіравання, бізнес і інавацыі, сацыяльны капітал і асабістая свабода.

У 2010 годзе першае месца ў рэйтынгу заняла Нарвегія, другая пазіцыя ў Даніі. Далей ідуць Аўстралія, Новая Зеландыя, Швецыя, Канада, Швейцарыя, Нідэрланды. З постсавецкіх краін найбольш паспяховымі ў дадзеным даследаванні выступаюць Эстонія (35-е месца), Літва (42-е), Латвія (47-е), Казахстан (50-е).

Больш нізкі рэйтынг, чым Беларусь, у 2010 годзе маюць Расія (63), Украіна (69), Узбекістан (76) і Малдова (86). Такім чынам, наша краіна стала пятай па ўзроўню працвітання сярод былых савецкіх рэспублік.




*Для многіх беларусаў выраз "квітнеючая краіна" цвёрда атаясамліваецца з чаркай дый шкваркай*

**ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ, БАРД, ГРОДНА:**

## «ПАГЛЯДЗІЦЕ, ЯК ЖЫВУЦЬ НАШЫ СТАРЫЯ».

– Гледзячы на тое, як апрануты пенсіянеры ў цягніку «Гродна–Парэчча», я не ўпэўнены, што жыву ў квітнеючай краіне. 54-е месца – гэта не нагода для радасці. Вось каб гэта была першая трыццатка. Калі людзі добра зарабляюць, яны могуць сабе дазволіць паляжаць гадзінку ў хаце, а не спяшаюцца на ранішні цягнік, каб збіраць грыбы. Ніколі не забуду сцэну, якую назіраў у Германіі. Я бачыў двух нямецкіх пенсіянераў: ён, такі божы дзьмухавец у беленькай кашульцы, і яна, у акулярыках. Яны спакойна сядзелі на беразе рэчкі, размаўлялі і елі бутэрброды. Гэта ідэал, калі старыя людзі ездзяць па свеце, нешта глядзяць. І, на жаль, нам да гэтага пакуль што далёка.

**ВАЛЯНЦІНА ВАРАНОВІЧ, ПРАДПРЫМАЛЬНІЦА, ГОМЕЛЬ:**

## «МЫ КВІТНЕЕМ ЗА КОШТ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ».

– Калі б вясной 1939 года Германію ацаніць па гэтым індэксе, яна б не апошняе месца заняла, а вельмі добрае месца па адукацыі, медыцыне. Па інфраструктуры Беларусь значна лепшая за Расію з Украінай. Дарогі лепшыя, «хуткія дапамогі» прыязджаюць у вёскі, ДАІшнікі не вымагаюць хабар пад аўтаматам. Беспрытульнікаў малалетніх няма. Нармальна. Ці можна гэта назваць працвітаннем, не ведаю. Напэўна, аўтары рэйтынгу не памыліліся. Але працвітанне для некаторых звязана не толькі з «чаркай і шкваркай». Для кагосьці гэта мова, для кагосьці – правы чалавека. Але для большасці – гэта чарка і шкварка. Пэўны час так працвітаць можна. Але не доўга. Мы гэты дабрабыт пазычаем у дзетак і ўнукаў. Мы ў іх пазычаем лядовыя палацы, планавую эканоміку. І нядрэнна жывём. Але доўг расце. І відаць, за ім хутка прыйдуць.

# ТОК-ШОУ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**Рэгістрацыя кандыдатаў 18 лістапада сабой нечым нагадвала ток шоу. Вядучыя (сябры ЦВК) і ўдзельнікі (кандыдаты) практыкаваліся паміж сабой у дасціпнасці. У наступны раўнд прайшлі ўсе.**



*Павал Севярынец, кіраўнік выбарчага штаба Віталя Рымашэўскага, у будучыню свайго шэфа глядзіць з аптымізмам*

Першай Андрэя Саннікава павіншавала жонка Ірына Халіп. У Палац Рэспублікі пускалі з галоўнага ўваходу.

Кастусёў з Радзьковым па беларуску

Павел Севярынец прадстаўляў інтарэсы Віталя Рымашэўскага. На столік побач з сабой ён паставіў невялікі бел чырвона белы сцяг.

Рыгор Кастусёў адразу пацісnуў руку Радзькову. Пачалі паміж сабой нешта ажыўлена абмяркоўваць.

Потым папытаўся ў Кастусёва, пра што гаварылі. «Ну, ужо неаднаразова сутыкаліся паміж сабой, успаміналі нашы папярэднія сустрэчы. Размаўлялі па беларуску», — сказаў прадстаўнік Партыі БНФ.

Апошнім з кандыдатаў з'явіўся Мікалай Статкевіч. Амаль адразу Лідзія Ярмошына і пачала пасяджэнне ЦВК. Найперш невялікі экскурс у мінулыя этапы кампаніі зрабіў сакратар ЦВК Мікалай Лазавік. Казаў, што ўсё было дэмакратычна. А вось подпісы збіраліся амаль усімі з парушэннямі. Апроч каго б вы падумалі? Правільна, Аляксандра Лукашэнкі. У зале пранёсся смяшок.

Не прамінуў магчымасці Лазавік паіранізаваць з Мікалая Статкевіча. «Самыя лепшыя зборшчыкі подпісаў былі ў Мікалая Статкевіча. Яны маглі ўгаварыць паставіць подпісы нават памерлых. Толькі ў Віцебску 20 нябожчыкаў распісалася за Статкевіча».

Зрэшты, вырашылі, што 100 тысяч сабралі дзесяць кандыдатаў. А вось тут і пачалося цікавае. Сталі абмяркоўваць, ці рэгістраваць Уладзіміра Правальскага.

Паводле звестак ЦВК, гэты кандыдат назбіраў аж (удумайцеся толькі ў гэтую лічбу) 118 подпісаў!

## МІХАЛЕВІЧ ЗРАБІЎ КАМПЛІМЕНТ АБ ДЭМАКРАТЫЧНАСЦІ

У алфавітным парадку першым зарэгістраваны быў Рыгор Кастусёў. Кандыдат у БНФ у сваёй прамове сканцэнтраваўся на тым, што ў апазіцыйных кандыдатаў па ранейшаму няма доступу да СМІ. А многія незалежныя выданні выкінутыя з сетак распаўсюду.

Наступным быў Лукашэнка. І тут пярэчанняў ні ў каго не ўзнікла. Аляксандр Радзькоў выступіў хутка. Найперш дзякуючы тым, хто за дзейснага кіраўніка подпісы і тым, хто распісаўся.

Жонка Міхалевіча памылілася ў дэкларацыі на 900 тысяч рублёў. Дробязь, вырашылі сябры камісіі. Ёсць трэці кандыдат.

Самыя вялікія пытанні па рэгістрацыі былі з Уладзімірам Някляевым. Высветлілася, што ў дэкларацыю ён не падаў 20 акцый «Прыёрбанка». У прынцыпе, гэта дастаткова, каб кандыдата зняць з дыстанцыі, але не ў нашых сённяшніх умовах.

## РАМАНЧУК ПАДКАЛОЎ ЯРМОШЫНУ

Някляеву ўсё прабачылі. Нават Ярмошына і Лазавік на гэтым настойвалі, бо самы ж актыўны кандыдат. Прадстаўнік Някляева Васіль Лявонаў перакананы, што ў налета ў Беларусі будзе новы прэзідэнт.

Яраслаў Раманчук выйшаў за пасведчаннем кандыдата з кнігай пра Парыж. «Гэта здзек з мяне ці спачуванне?» — запыталася невыязная Ярмошына. «Гэта гаворыць пра тое, калі мы станем дэмакратычнымі, то ў Парыжы змогуць пабываць усе, нават Вы», — адказаў ліберальны эканаміст.

## «ПЕРАДАЙЦЕ ГАСПАДАРУ ВАШАГА БАЛАГАНА»

Прамова Саннікава была найбольш падрыхтаванай за астатнія. Прамаўляў кандыдат добра. «Нашу краіну называюць апошняй дыктатурай. Гэта ганьба для краіны. Але гэта справядліва».

Саннікаў згадаў пра зніклых палітыкаў. Ён прапанаваў ушанаваць Віктара Ганчара хвілінай маўчання. «Беларусы не хочуць жыць пры дыктатуры. У нас ёсць шанец змяніць. Я зраблю ўсё, каб зрабіць Беларусь дэмакратычнай», — заначыў ён.

Мікола Статкевіч уцягнуўся ў дыскусію з Лазавіком, адказваючы на яго ныя закіды. «Перадайце гаспадару вашага балагана, што я клоўнам у гэтым балагане не буду», — як і Кастусёў з Севярынцам, Статкевіч прамаўляў па беларуску.

Голас Цярэшчанкі быў вельмі манатонны. А ў Дзмітрыя Уса ў дэкларацыі не хапала аж 4,5 мільёнаў. Тым не менш, гэта менш за 20% прыбытку. Зарэгістравалі і яго.

## ПАЧНЕ ЦЯРЭШЧАНКА

Пасля гэтага Ярмошына агучыла, што дэбаты будуць праходзіць толькі ў жывым эфіры. Пайшлі на саступку апазіцыйным кандыдатам, якія настойвалі на гэтым. А вось выступы па ТБ могуць як у жывым эфіры, так і ў запісе. Вырашаць самім кандыдатам.

Лёсаванне эфірнага часу адбывалася так, што кандыдат цягнуў канверт з парадкавым нумарам. Адкрываць сезон тэлевыступаў выпала Цярэшчанку. Раманчук будзе другім. Далей — Някляеў, Лукашэнка, Міхалевіч, Рымашэўскі, Ус, Статкевіч, Кастусёў, Саннікаў.

На вуліцы кандыдатаў віталі іхнія каманды. На скайп сувязі з Кастрычніцкай плошчай быў Уладзімір Някляеў. Ён у той момант знаходзіўся ў польскім МЗС. Саннікаў нават троху паразмаўляў з сябрам канкурэнтам.

Яшчэ адзін этап пройдзены. Цяпер пачынаецца месяц агітацыі.

**ЗМІЦЕР ПАНКАВЕЦ,**
**NN.BY**

# Д.ГРЫБАЎСКАЙТЭ ЛІЧЫЦЬ ЛУКАШЭНКУ ГАРАНТАМ СТАБІЛЬНАСЦІ?

**У Літве, дзе, мабыць, ужо паспелі забыцца пра дыскусіі палітыкаў вакол дыпламатычнага курсу краіны, прагрымеў новы стрэл. Так пачынае свой каментар**

Знаёмім вас са зместам каментару:

“Парламентарый-кансерватар М.Адаменас, які, дарэчы, не абцяжарвае сябе працай ні ў парламенцкім камітэце замежных спраў, ні ў камітэце спраў Еўропы, учора публічна абвясціў аб небяспецы.

Палітыка спалохала паведамленне, якое апублікавала на мінулым тыдні агенцтва Reuters. У ім цытуюцца неназваныя еўрасаюзаўскія дыпламаты, якія сказалі, што прэзідэнт Д.Грыбаўскайтэ нібыта лічыць перамогу беларускага дыктатара А.Лукашэнкі на снежаньскіх выбарах гарантыяй стабільнасці ў Беларусі.

Выказаўшы вялікую занепакоенасць, але падкрэсліўшы, што ён усё яшчэ не гаворыць пра “здраду”, М.Адаменас запатрабаваў, каб Д.Грыбаўскайтэ публічна абвергла сваю падтрымку Лукашэнку.



*Літоўскі прэзідэнт апошнімі выказваннямі наконт будучыні Беларусі выклікае шмат пытанняў не толькі ў нашай краіне*

Сапраўды ўражвае “каштоўнасная” пазіцыя кансерватара. Тым больш што дыскусіі аб замежнай палітыцы ў Літве надзвычай патрэбныя. Толькі ў шчырасць М.Адаменаса чамусьці верыцца цяжка.

Цяжка толькі таму, што М.Адаменас не забіў у званы трывогі мінулай восенню. Тады пампезны прыём А.Лукашэнкі ў Вільні сапраўды мусіў выклікаць сур'ёзныя сумненні.

А цяпер усё крыху іначай. Ні дзеянні Д.Грыбаўскайтэ, ні словы нібыта і не выклікаюць падазрэнняў. А патрабаваць, каб кіраўніца дзяржавы публічна абвергла ананімныя паведамленні пра падтрымку А.Лукашэнкі, нават крыху смешна. І не толькі таму, што ў сусветнай дыпламатычнай практыцы кіраўнікі дзяржаў не каменціруюць ананімных сцвярджэнняў.

Проста М.Адаменасу варта было б хаця б пацікавіцца, што Д.Грыбаўскайтэ нядаўна рабіла ў Мінску. Ён даведаўся б, што прэзідэнт сустрэлася там з прадстаўнікамі апазіцыі і выказала ім падтрымку.

Дык чаму кансерватар ні з таго ні з сяго вырашыў зладзіць невялічкае шоу? Можа, гэта спроба “каштоўнаснай” знешнепалітычнай пазыцыяй прыкрыць шлейф скандалаў, які цягнецца за ім самім?” –– задае рытарычнае пытанне аўтар каментару.

Дэпутат Сойма Мантас Адаменас апошнімі гадамі быў замешаны ў розныя палітычныя скандалы. Самы гучны з іх датычыўся атрымання Інстытутам дэмакратычнай палітыкі, якім ён кіраваў, 2,5 млн літаў у выніку публічнага конкурсу на праект рэйтынгавання літоўскіх універсітэтаў. У той час Адаменас быў адначасова дэпутатам і мог уплываць на прыняцце адпаведнага рашэння.

**РАДЫЁ СВАБОДА**

# МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ПАМЯЦЬ АБ ЗАГІНУЛЫХ

**У Савеце бяспекі абмяркоўваюць прычыны аварыі на аб’яднанні «Пінскдрэў», у якой загінулі 14 чалавек, але вынікаў не паведамляюць.**

Паводле слоў супрацоўніка Савета бяспекі, які прасіў не называць яго імя, прычыны аварыі на «Пінскдрэве» павінна паведаміць спецыяльная камісія, якая працавала ў Пінску пасля аварыі 25 кастрычніка. Пра высновы, якія зробіць Савет бяспекі, будзе паведамлена пазней.

Тым часам становіцца вядома ўсё больш падрабязнасцей і акалічнасцей як самой аварыі, так і цяперашняй сітуацыі на заводзе ДСП, дзе адбыўся выбух.

Розныя крыніцы сыходзяцца ў меркаванні, што першы выбух адбыўся на ўчастку для вырабу пілетаў — гранул з пілавіння, якія спальваюць у ацяплякльных катлах. Але чаму выбух на гэтым участку выклікаў выбух і пажар ва ўсім цэху драўнянастружкавых пліт?

Мой суразмоўца Мікалай сустракаўся з тымі, хто працуе на «Пінскдрэве», і задаваў менавіта гэтае пытанне. Паводле слоў супрацоўнікаў, пасля першага выбуху ўзарваліся алейныя катлы, якія забяспечвалі кампрэсію пры вырабе стружкавых пліт. Але гэтыя выбухі можна было б прадухіліць, калі б на «Пінскдрэве» не эканомілі на неабходнай абароне катлоў, гаворыцца ў крыніцы.

« Мусіла спрацаваць абарона катлоў, але яе не было, таму адбыўся так званы гідраўдар.

У выніку другога выбуху ўзляцелі адразу чатыры катлы».

Паводле гэтай крыніцы, адразу ад выбуху і разбурэнняў загінула каля 20 чалавек. Нібыта ўвечары 25 кастрычніка «шмат цел загінулых у мяшках» людзі бачылі на тэрыторыі прадпрыемства. Гэтая версія, аднак, супярэчыць афіцыйным паведамленням. У першых афіцыйных звестках гаварылася пра аднаго загінулага, да канца дня колькасць загінулых дасягнула трох, потым колькасць ахвяр павялічылася за кошт памерлых у шпіталях і спынілася на лічбе 14.

Алёна Козюр, дачка загінулага аператара Генадзя Козюра, які працаваў на ўстаноўцы па выбары пілетаў, пацвярджае, што дагэтуль ходзяць чуткі пра вялікую колькасць загінулых:

«Я таксама чула, што было больш загінулых. Але так гэта ці не, хто ж праўду скажа? Нічога дагэтуль невядома».

Пра прычыны аварыі Алёна Козюр пэўных версій не мае, але кажа, што будынак цэха быў стары, 1917 года пабудовы, з сярэдзіны 60-х гадоў яго прызналі аварыйным: «Не дзіва, што ён ад выбуху склаўся, як скрыначка».

**АЛЕГ ГРУЗДЗІЛОВІЧ**

www.kamunikat.org

# САМЫЯ ПАПУЛЯРНЫЯ СТРАХІ БЕЛАРУСАЎ

**Беларусы больш за ўсё апасаюцца павышэння коштаў на прадукты і на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Яшчэ баяцца страціць працу. Сярод іншых страхаў таксама паніжэнне заробку, магчымая дэвальвацыя рубля і павышэнне падаткаў.**

Гэта вынікае з чарговага нацыянальнага апытання, якое ў кастрычніку гэтага года правялі сацыёлагі з Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД).

Прычым, па ацэнках незалежных сацыёлагаў, вышэйпералічаныя страхі – па-за палітыкай. Бо пра іх наяўнасць гаварылі і тыя, хто бязмежна давярае цяперашняму кіраўніку дзяржавы, і тыя, хто не з'яўляецца прыхільнікам Аляксандра Рыгоравіча.

*"Што да асцярог з нагоды страты працы, зніжэння заробку, дэвальвацыі рубля і павышэння падаткаў, то адзначаная нязначная розніца, хутчэй за ўсё, звязана не з палітычнымі перавагамі рэспандэнтаў, а з іх узростам: сярод тых, хто давярае цяперашняму кіраўніку дзяржавы, пераважаюць пенсіянеры,* – каменцірующь вынікі сацыёлагі. – *Страта працы ім не пагражае, і праблема дэвальвацыі для іх не надта актуальная. Усё чакана і з узроўнем даходаў. Сярод тых, чый сярэдні даход на аднаго члена сям'і не перавышае 270 тысяч рублёў, асцярогу з нагоды магчымай дэвальвацыі выказалі 18,6%. Сярод найбольш забяспечаных людзей (якія зарабляюць больш за 900 тысяч рублёў) – 28,3%.*

## ХЛЕБ НАДЗЁННЫ – САМАЕ АКТУАЛЬНАЕ

Былы міністр працы Беларусі **Аляксандр Сасноў**, аналізуючы былыя і цяперашняе апытанні НІСЭПД, кажа, што ў параўнанні з мінулымі гадамі страхі беларусаў не моцна змяніліся.

*"Увесь час на першым месцы стаялі матэрыяльныя праблемы,* – гаворыць Аляксандр Віктаравіч. – *Не дарэмна ж Аляксандр Рыгоравіч кажа: была б толькі*




*Баяцца трэба не прусакоў*

*чарка і шкварка. Большасць людзей так і думае. Ну, яшчэ старыя людзі кажуць: абы не было вайны. А так матэрыяльныя клопаты – на першым месцы. Больш за ўсё хвалявалі рост коштаў, збядненне, спад вытворчасці. На павышэнне падаткаў простыя людзі, як правіла, увагі амаль што не звяртаюць – падаткі больш б'юць па бізнесе, чым па насельніцтве. Таму нічога незвычайнага для мяне ў свежых выніках апытання няма. Прыкладна такі ж расклад быў і раней. Незалежнасць, нейкія палітычныя тэмы – гэта людзей хвалюе, як правіла, у апошнюю чаргу".*

"Матэрыяльна скіраванай" Аляксандр Сасноў называе не толькі нашу нацыю.

*"Хлеб надзённы – гэта тэма, якая актуальная абсалютна для ўсіх",* – кажа былы міністр працы.

## ЯК КРАДЗЕНАЯ САЛЯРКА АДБІВАЕЦЦА НА КОШТАХ

Адзін з прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду, намеснік старшыні Партыі БНФ **Рыгор Кастусёў** гаворыць, што на сустрэчах у рэгіёнах людзі часцей за ўсё заводзяць размовы пра цэны. І што яго самога таксама хвалююць кошты на прадукты.

*"Многія людзі перакананыя, што цэны на прадукты могуць падскочыць яшчэ раней, чым павысяць заробкі, стыпендыі і пенсіі,* – дзеліцца назіраннямі Рыгор Андрэевіч. – *Я таксама заўважаю змяненні коштаў, бо некаторыя прадукты купляю ў магазінах. Але шмат чаго і сваёго вырошчваю – моркву, бульбу, буракі і г.д. Наша беларуская глеба і нямецкая па якасці практычна аднолькавыя. Але калі на немца прыходзіцца каля 2 сотак зямлі, то ў нас – 60-62. Але ў Нямеччыне існуе праблема збыту прадуктаў: там перавытворчасць і ўводзяцца абмежаванні для фермераў. А мы не можам выканаць харчовую праграму. Чаму? Таму што нашы калгаснікі (я іх называю прыгоннымі сялянамі) не зацікаўлены ў выніках сваёй працы. Фермер хоча атрымаць добры ўраджай, бо ад гэтага залежыць яго ны дабрабыт. А нашыя прыгонныя сяляне думаюць, як бы салярку скрасці. Таму маем тое, што маем…"*

## КАМУНАЛЬНАЯ ПЕСНЯ

Рыгор Кастусёў некалькі гадоў "руліў" усёй шклоўскай жыллёва-камунальнай гаспадаркай. І добра ведае, што пытанні, звязаныя з ЖКГ, хвалююць людзей. Яшчэ Кастусёў перакананы, што з цягам часу беларусы будуць на 100 працэнтаў аплочваць паслугі ЖКГ.

*"Гэта непазбежнасць,* – сцвярджае палітык. – *Але ў звязку з гэтым мы павінны і заробкі атрымліваць 100-працэнтныя, без цяперашніх утрыманняў, якія мы нават, можа, і не заўважаем. А даплаты за камунальныя паслугі, якімі так ганарыцца дзяржава, – гэта ўсё роўна грошы, узятыя з нашай кішэні. Таму трэба людзям вярнуць іхнія заробкі, прыбраць усе схаваныя ўтрыманні і перайсці на 100-працэнтную аплату камунальных паслуг. Гэта закон рынку".*

Акрамя таго, Рыгор Кастусёў лічыць, што ў Беларусі абавязкова трэба прыняць меры па забеспячэнні скарачэння сабекошту камунальных паслуг.

*"Я літаральна днямі прагледзеў канцэпцыю развіцця камунальнай гаспадаркі на 2004–2015 гады. З яе вынікае, што да канца 2012 года лазневая, гатэльная гаспадарка ў нашай краіне павінна быць цалкам перададзена ў прыватную ўласнасць,* – гаворыць Кастусёў. – *Да канца 2010 года 60% жылля павінна абслугоўвацца на ўмовах канкурэнцыі – гэта значыць, за кошт стварэння альбо перадачы дзяржаўных прадпрыемстваў камунальнай гаспадаркі ў прыватную ўласнасць. Але ж гэта не выканана!*

*Больш за тое, цалкам правалена прынятая раней праграма энергазберажэння. Калі памятаеце, была прынята такая праграма на замяшчэнне газу, нафтапрадуктаў у камунальнай гаспадарцы мясцовымі відамі паліва. У мяне ёсць цікавыя даныя па 2007–2008 гадах. Пры тым, што мясцовыя віды паліва нашмат таннейшыя, сабекошт цяпла, які адпускаецца насельніцтву, на дровах атрымаўся даражэйшым, чым на газ. У мяне ёсць канкрэтныя прыклады па шклоўскім камунгасе..."*

**МАРЫНА МІТ**

**ПЫТАННЕ: "ЧАГО ВЫ АПАСАЕЦЕСЯ ДЛЯ СЯБЕ І СВАЁЙ СЯМ'І Ў БЛІЖЭЙШЫ ЧАС?"**

| Варыянт адказу | 10'10 | | |
|---|---|---|---|
| | Усе апытаныя | Давяраюць Лукашэнку | Не давяраюць Лукашэнку |
| Рост цэн на асноўныя прадукты | 65.2 | 64.1 | 66.2 |
| Рост цэн на камунальныя паслугі | 52.3 | 51.0 | 51.1 |
| Страціць працу | 36.9 | 33.6 | 40.9 |
| Зніжэння заработнай платы | 25.7 | 22.8 | 27.9 |
| Магчымай дэвальвацыі беларускага рубля | 25.4 | 22.0 | 28.8 |
| Павышэння падаткаў | 13.3 | 12.9 | 15.2 |

# КУДЫ ЗНІКАЮЦЬ БЕЛАРУСКІЯ ГАБРЭІ?

Летась у Беларусі адбыўся агульнанацыянальны перапіс насельніцтва, першыя вынікі якога былі агучаны ўсяго два месяцы назад. Сярод іншых лічбаў незаўважаным засталося рэзкае скарачэнне габрэйскага насельніцтва. Калі, паводле перапісу 1999 года, габрэямі сябе назвалі амаль 29 тысяч чалавек, то цяпер ажно ў 2,5 разу меней — толькі 12,9 тысячы.

http://belstat.gov.by/homep/ru/perepic/2009/publications/bul_republic.rar

Карэспандэнт “Тут і цяпер” паспрабаваў разабрацца, куды знікае адна з самых масавых нацыянальных меншасцей Беларусі.

## З МІЛЬЁНА ДА 12 ТЫСЯЧ

Габрэі стала жывуць на Беларусі з XV стагоддзя, калі атрымалі ад князя Вітаўта прывілей на вольнае пражыванне на землях Вялікага Княства Літоўскага.

У 1897 годзе агульная колькасць габрэяў на Беларусі дасягнула 724,5 тысячы чалавек (ці 13,6% ад усяго насельніцтва Паўночна-Заходняга краю). Прычым, у Мінску нашчадкі Давіда складалі 52% ад усяго насельніцтва, у Віцебску — 52, 4%, у Магілёве — 50%, у Пінску — 74, 2%, у Гомелі — 54, 8%.

"За ўвесь час сумеснага жыцця беларусаў і жыдоў на Беларускай зямлі гэтыя дзве нацыі псіхічна шмат пераняли адна ад аднэй. У мовах, у звычаях, у легендах, у будаўніцтве, у будзённым жыцці — у іх формы так перамяшаліся, што прынялі новую самабытную акрасу”, — пісаў на ўздыме беларускага адраджэння класік нашай літаратуры Змітрок Бядуля.

У 1926 годзе толькі ў БССР налічвалася 407 тысяч габрэяў, а мова ідыш разам з беларускай, расійскай і польскай мела дзяржаўны статус.

Потым было ўз’яднанне з Заходняй Беларуссю, нямецкая акупацыя і Халакост, у полымі якога загінула 800 тысяч беларускіх габрэяў.

Паводле перапісу 1959 года, у БССР было 150 тысяч габрэяў, у 1979-м — 135 тысяч, у 1989-м — толькі 112 тысяч. Затым пачалася масавая рэпатрыяцыя на гістарычную радзіму. За два гады (1989–1991) з Беларусі ў Ізраіль выехала блізу 50 тысяч чалавек.

Першы перапіс насельніцтва ў незалежнай Беларусі засведчыў, што ў Беларусі 27,8 тысячы габрэяў. Прайшло яшчэ 10 год, і, калі верыць афіцыйным лічбам Белстата, габрэяў у Беларусі ўсяго 12926, ці 0,1% ад агульнага насельніцтва. Па рэгіёнах больш за ўсё габрэяў жыве ў Мінску (5187), менш за ўсё – на Гродзеншчыне (537).

Як і 40 год назад, габрэі ўсё яшчэ займаюць чацвёрты радок па колькасці прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у Беларусі (пасля расіян, палякаў і украінцаў). Аднак адрыў ад іх стаў катастрафічным, а “на пяткі наступаюць” армяне, татары, цыганы, азербайджанцы і літоўцы (ад 8 да 5 тысяч чалавек).




*Габрэі і цяпер “пешкі ў чужой гульні”?*

## “МНОГІЯ САРОМЕЮЦЦА ІДЭНТЫФІКАВАЦЬ СЯБЕ З ГАБРЭЙСТВАМ”

Аб гэтым “Тут і цяпер” пацікавіліся ў палітолага, экс-выдаўца беларуска-габрэйскага бюлетэня “Мы яшчэ тут!” **Вольфа Рубінчыка**.

— Перш за ўсё, не назваў бы зніжэнне колькасці габрэяў за апошняе дзесяцігоддзе “катастрафічным”. Яно было б такім, калі б раней падобнай тэндэнцыі не назіралася. Але ж у 1989–1999 гады колькасць габрэяў у Беларусі знізілася не ў 2,2, а ажно ў 4 разы (са 112 тысяч да 28 тысяч). У 2002 годзе навукоўцы з Брэста Яўген Розенблат і Ірына Яленская акрэслілі гэтую з’яву так: "Сёння няма ніякіх падстаў для аптымістычных прагнозаў: колькасныя змены, якія адбыліся ў XX ст., з’яўляюцца незваротнымі".

**— У чым прычыны істотнага скарачэння габрэйскага насельніцтва?**

— Месяц таму газета іудзейскага рэлігійнага аб’яднання “Берега” адгукнулася на звесткі Белстату жартам, маўляў, габрэі — чэмпіёны па хованках (рэальна нас быццам бы не менш за 40 тысяч). Але не думаю, што сёння ёсць ад каго хавацца. Ад дзяржавы? Дык ёй усё роўна, як сябе называюць грамадзяне, абы грошы давалі. Ад антысеміцкіх груповак? Дык наўрад ці перапісчыкі мелі да іх якое-небудзь дачыненне. Хаця не выключаю, што хтосьці з рэспандэнтаў нёс у душы свой страх з савецкіх часоў.

Можна шмат разважаць пра дэмаграфію, эміграцыю і г.д. Так, габрэі — ці не самая старая этнаканфесійная група тут, і памірае людзей значна больш, чым нараджаецца. Так, нехта яшчэ з’язджае за мяжу (хаця нехта з яўрэяў і вяртаецца назад). Аднак мне здаецца, што ёсць і іншая важная прычына: многія асобы, асабліва мяшанага паходжання, саромеюцца ідэнтыфікаваць сябе з габрэйствам. У тым ліку і з-за таго, што пры цяперашняй уладзе габрэі сталі “пешкамі ў чужой гульні”, занадта залежнымі ад паводзін улады і міжнародных суполак. За 20 гадоў працы “габрэйскіх арганізацый” не з’явілася аўтаномнай габрэйскай супольнасці. З большага гэтыя арганізацыі ўзначалілі людзі з камуністычнага мінулага, якім развіццё такой супольнасці не патрэбнае.

Некаторыя шансы на лепшую будучыню магло б даць стварэнне альтэрнатыўнай усебеларускай габрэйскай арганізацыі, ключавыя пасты ў якой занялі б маладыя людзі з несавецкім светапоглядам, якія атрымалі добрую адукацыю і ўмеюць зарабляць грошы і трымаць слова. Але ў сённяшніх умовах яна наўрад ці будзе зарэгістравана.

**— 10 год назад 5,4% габрэйскага насельніцтва назвалі роднай мовай габрэйскую. Цяпер — толькі 2,8%. З чым гэта звязана?**

— Лёс моў — тэма асобнай размовы. Скажу толькі, што ад фільмаў кшталту “В поисках идиша”, за які спадар Хашчавацкі атрымаў прэмію за мяжой, нашай культуры і самасвядомасці вялікай карысці няма. Ад “Ідыш-беларускага слоўніка”, складзенага Алесем Астравухам, карысці крыху больш, ды ўсё адно мова ідыш у сённяшняй Беларусі — этнаграфічная з’ява, а не жывы феномен культуры. Баюся, так будзе і надалей.

Сістэма “яўрэйскай адукацыі” ў Беларусі — хутчэй імітацыя бурнай дзейнасці. А нядзельных школ відавочна недастаткова, каб іўрыт ці ідыш сталі для тутэйшых яўрэяў роднымі мовамі. Тым часам пакаленне людзей, якія навучаліся паяўрэйску да вайны, сыходзіць.

**— Ці азначае гэтая тэндэнцыя, што праз 10 год габрэяў у Беларусі стане пароўну з цыганамі ці азербайджанцамі?**

— Мяркую, што яўрэяў стане менш, чым цыганоў ці азербайджанцаў, а нават і кітайцаў. Калі толькі ў гэты перыяд не адбудзецца вялікай вайны ў Ізраілі, якая падштурхнула б сацыялагічна значную частку яўрэяў – выхадцаў з Беларусі да рээміграцыі.

**ІГНАТ ХАДЗЬКЕВІЧ**

# МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ СТАВІЦЬ СУМНІЎНЫЯ РЭКОРДЫ

**У Магілёўскай вобласці ні адзін з больш як 100 дэмакратычных кандыдатур на членства ва ўчастковых выбарчых камісіях featuring розгага ўзроўню не быў ў іх уключаны.**

## МЯСЦОВЫ "ПЕРАГІБ"

Гэтымі днямі такая выснова стала канчатковай у выніку адмоўных рашэнняў раённых (у абласным цэнтры) і некаторых уласна раённых судоў, у якіх дэмакраты безвынікова спрабавалі аспрэчыць рашэнні па фарміраванні ўчастковых камісій па выбарах прэзідэнта краіны. Аднак, як падаецца, гэтая магілёўская "дэталь" (а многія называюць яе своеасаблівым рэкордам) не надта адбіваецца на агульным успрыманні сёлетняй беларускай выбарчай кампаніі як кампаніі "ліберальнай і адкрытай". Так, прапагандуюць і аналізуюць кампанію не толькі дзяржаўныя СМІ, унутраныя і незалежныя назіральнікі, свае і замежныя палітолагі, але і высокія выбарчыя візіцёры з еўрапейскіх краін. На гэтым фоне неўключэнне ў нейкім там рэгіёне (усяго-та ў адным з 6-ці, калі браць пад увагу абласны адміністрацыйны падзел) у выбарчыя камісіі прадстаўнікоў "справядлівых камуністаў", аб'яднаных грамадзян, народнафронтаўцаў, а разам з імі і рэгіянальных праваабаронцаў, падаецца не больш як мясцовым "перагібам". А таму ён і не надта псуе агульную дэмакратычную карціну: маўляў, не ўсё адразу, спадары еўрапейцы. Гэтыя рэгіянальныя дэмакраты маглі і наблытаць што-небудзь у тэрмінах ці ў дакументах. А маглі выставіць амбіцыі, непрапарцыянальныя малой колькасці сваіх арганізацыйных структур і чальцоў у іх.




Нам падалося, што будзе карысна для гісторыі занатаваць некаторыя з імён і сітуацый нашай рэчаіснасці.

**МАГІЛЁЎ**

8—11 лістапада, 2010 г. Разгляд у Ленінскім і Кастрычніцкім судах скаргаў дэмакратычных арганізацый на неўключэнне ў склад участковых камісій іх прадстаўнікоў.

На судовых пасяджэннях старшынствавалі суддзі Юлія Трапыніна, Наталля Канцадал, Алена Дыбленка, Вікторыя Дзядкова. У працэсах удзельнічалі пракуроры Павал Палянскі, Алена Ісакава, Арцём Маймусаў, Алена Дуброўская. Ад раённых адміністрацый рашэнні "па неўключэнні" адстойвалі іх прадстаўнікі Дзмітрый Цімафеенка, Аляксандр Паддубны, Наталля Халецкая.

Рашэнні судоў для дэмакратаў былі адмоўнымі.

**КРЫЧАЎ**

9 лістапада, 2012 г. Разгляд у Крычаўскім раённым судзе скаргаў дэмакратычных арганізацый на неўключэнне ў склад участковых камісій іх прадстаўнікоў.

На пасяджэнні старшынствавала суддзя Алена Азаранка. У працэсе браў удзел пракурор Уладзімір Трывайла. Ад выканкама рашэнне "аб неўключэнні" адстойваў прадстаўнік Уладзімір Зыкаў.

Рашэнне суда для дэмакратаў было адмоўным.

## ЧАСТКА ВЫКАНАЎЧАЙ УЛАДЫ?

**Валерый Беразіенка, старшыня абласной арганізацыі "Справядлівы свет":**

— Кідаецца ў вочы тое, што рашэнні ўсіх гэтых судоў падобныя адно на адно як дзве кроплі вады. Усе суддзі спасылаюцца на аднолькавыя артыкулы адпаведнага заканадаўства і Канстытуцыі. Прыведзеныя намі артыкулы пад увагу судамі не браліся. На маю думку, асабліва цынічна быў парушаны артыкул 34 Выбарчага кодэкса. Там гаворыцца, што мясцовыя адміністрацыі ў гарадах з раённым падзелам ствараюць "участковыя выбарчыя камісіі ў складзе 5—19 чальцоў". Ніводная камісія на той дзень, як мы падалі дакументы на сваіх вылучэнцаў, у поўным складзе яшчэ не была. Але зацвярджэнне іх персанальных складаў ужо адбылося. Гэта можна было б зразумець, калі б не новыя прэтэндэнты! Аднак ад свайго паспешлівага рашэння адміністрацыя не адступілася. І суд падтрымаў яе, а не нас.

**Уладзімір Краўчанка, дырэктар Магілёўскага праваабарончага цэнтра:**

— Каб забяспечыць тое, пра што так нібыта шчыра гавораць у ЦВК, — фактычную незалежнасць і аб'ектыўнасць выбарчых камісій, — вядомы толькі адзін спосаб. Трэба ў камісіях стварыць баланс палітычных сіл. А для гэтага неабходна, па-першае, каб у кожнай камісіі былі прадстаўлены тыя палітычныя сілы, якія ўдзельнічаюць у выбарах. Па-другое, трэба, каб у камісіі не ўваходзілі людзі, што знаходзяцца ў службовым падначаленні паміж сабой.

**ВІКТАР ВОЙТ**

# МІНКУЛЬТУРЫ ВОЗЬМЕЦЦА ЗА «ЦЫБУЛІНЫ»

15 лістапада ў Навагрудак прыязджаў прадстаўнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, каб на месцы вырашыць пытанне ўсталявання на царкве Барыса і Глеба новых купалаў. Работы былі праведзены на мінулым тыдні. Аўтар праекта рэканструкцыі царквы — **Генадзь Лаўрэцкі**, дацэнт БНТУ, старшыня архітэктурна-мастацкай рады Беларускага экзархата. Згодна з яго праектам, на сценах царквы плануецца агаліць кладку XVI ст., а таксама, па магчымасці, галерэю і сцены ў стылі готыкі XII ст.

Дазвол на работы, насуперак запэўніванням чыноўнікаў Навагрудскага райвыканкама, атрыманы не быў. Больш за тое, па словах начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры **Ігара Чарняўскага,** адпаведныя дакументы яшчэ толькі рыхтуюцца. Прадстаўнік аблвыканкама і аддзел культуры Навагрудскага райвыканкама падрыхтавалі на адрас прыхода царквы Барыса і Глеба прадпісанне. Паводле яго, настаяцель царквы айцец Мікалай Орса павінен будзе падпарадкавацца рашэнню навукова-метадычнай рады, якое пакуль рыхтуецца, і ўнесці, згодна з ім, змены ва ўсталяваныя купалы.

Старшыня таварыства аховы помнікаў **Антон Астаповіч** каменціруе развіццё падзей вакол навагрудскай царквы з асцярожным аптымізмам. Па яго словах, раней падобныя інцыдэнты вакол аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны развіваліся па падобным сцэнарыі па ўсёй Беларусі. Будынкі цэркваў ці былых касцёлаў з ініцыятывы святароў і з маўклівай згоды мясцовых улад без дазволу Міністэрства культуры перарабляліся на свой капыл. Міністэрства ж умешвалася ў справу постфактум, калі часцей за ўсё ўжо было позна штосьці мяняць.

**СЯМЁН ПЕЧАНКА, NN.BY**

# САНТА КЛАЎС ЕДЗЕ Ў МІНСК

## Гэта адбудзецца 22 лістапада,

**паведамілі ў прадстаўніцтве авіякампаніі AirBaltic у Беларусі, якая выступае адным з арганізатараў мерапрыемства.**



Фінскі Санта Клаўс, ці, як яго называюць Ёўлупукі, напярэдадні зімовых свят штогод наведвае розныя гарады Еўропы. Сёлета ў яго графік упершыню ўключаны Мінск. Ёўлупукі ўжо бываў у нашай краіне: ён прыязджаў да Дзеда Мароза ў Белавежскую пушчу.

Падчас гэтага візіту фінскі Санта Клаўс пагутарыць з дзецьмі, наведае спартыўныя збудаванні Мінска, сустрэнецца з журналістамі.

***

Ёўлупукі жыве ў Лапландыі на гары Карватунтуры, якая па форме нагадвае вушы. Лічыцца, што менавіта дзякуючы такому жыллю-вуху Ёўлупукі можа чуць мары і жаданні ўсіх дзяцей. У Ёўлупукі ёсць жонка Муоры, якая ўвасабляе сабой зіму. Ёўлупукі служаць гномы, якія на працягу года сядзяць у Пячоры Рэха і слухаюць, як сябе паводзяць дзеці ва ўсім свеце, а перад Калядамі разбіраюць пошту, дапамагаюць рыхтаваць і пакаваць падарункі.

**БЕЛТА**

# ФУТБОЛЬНАЯ ЗБОРНАЯ БЕЛАРУСІ НА 40-М МЕСЦЫ Ў СВЕЦЕ!

**Сёння ФІФА апублікавала новы рэйтынг нацыянальных зборных свету. Асаблівых змен у спісе няма, бо з 20 кастрычніка (час публікацыі папярэдняга рэйтынгу) зборныя не гулялі.**

Проста вынікі некаторых старых матчаў зараз не ўлічваюцца, што толькі для некаторых пайшло або ў плюс, або ў мінус.

У дзясятцы лепшых змены мінімальныя: толькі Егіпет выцесніў з дзясятай пазіцыі Расію.

Узначальвае сусветны рэестр па-ранейшаму Іспанія,

на другім месцы Галандыя, на трэцім – Бразілія.

Зборная Беларусі крыху дабавіла і паднялася на дзве пазіцыі – з 42-га на 40-е месца. Гэта наш новы рэкорд!

Вось як выглядае топ-10 рэйтынгу ФІФА, а таксама паказчыкі Беларусі і яе сапернікаў па адборачнай групе Еўра-2012 (вылучаныя курсівам), нашага сённяшняга спарынг-партнёра (Амана), а таксама славянскіх краін і прадстаўнікоў СНД і Балтыі з першай сотні:

1 (1). Іспанія – 1920
2 (2). Галандыя – 1718
3 (3). Бразілія – 1493
4 (4). Германія – 1489
5 (5). Аргенціна – 1353
6 (6). Англія – 1250
7 (7). Уругвай – 1174
8 (8). Партугалія – 1102
9 (9). Харватыя – 1098
10 (11). Егіпет – 1047 ...
...
13 (10). Расія – 1003 ...
15 (15). Славенія – 958 ...
18 (20). Славакія – 866 ...
*21 (18). Францыя – 852 ...*
25 (22). Сербія – 828 ...
26 (26). Чарнагорыя – 827 ...
31 (31). Чэхія – 756 ...
36 (35). Украіна – 698 ...
**40 (42). Беларусь – 648 ...**
45 (43). Балгарыя – 597 ...
46 (48). Літва – 576 ...
*51 (53). Боснія і Герцагавіна – 542 ...*
*52 (50). Румынія – 538 ...*
*58 (65). Албанія – 520 ...*
59 (60). Арменія – 517 ...
71 (73). Польшча – 452 ...
73 (74). Латвія – 446 ...
74 (74). Эстонія – 444 ...
76 (70). Македонія – 439 ...
78 (75). Грузія – 422 ...
84 (78). Малдова – 405 ...
90 (91). Азербайджан – 381 ...
97 (96). Аман – 340 ...
133 (135). Люксембург – 175 ...

Сёння зборная Беларусі гуляе ў Маскаце з Аманам. Наступны рэйтынг ФІФА будзе апублікаваны 15 снежня.

**FOOTBALL.BY |**

# 8 10 370 672 829 35

## Каб аформіць падпіску “Тут і цяпер”

трэба адправіць смс са сваім адрасам на гэты нумар

## падпіска на газету “Тут і цяпер” - БЯСПЛАТНАЯ

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер” **Адрас** г. Мінск, вул. Касцюшкі, 18
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: info@svabodaby.net) **Падпісана ў друк** 22:45 18.11.10
Тыраж 299 экзэмпляраў